# YOUR ENGLISH LANGUAGE GRAMMAR ASSISTANT

# ВАШ ПАМОЧНІК ПА ГРАМАТЫЦЫ АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ

## Pronouns. / Займеннікі.

| **Адказваюць на пытанне «хто?», «што?»** | **Адказваюць на пытанне «чый?», «чыя?»** |
|---|---|
| **I** (я) | **my** (мой) |
| **you** (ты, вы) | **your** (твой, ваш) |
| **he** (ён) | **his** (яго) |
| **she** (яна) | **her** (яе) |
| **it** (ён, яна, яно) | **its** (яго, яе) |
| **we** (мы) | **our** (наш) |
| **they** (яны) | **their** (іх) |

1. **Займеннікі**, якія адказваюць на пытанне «хто?», «што?», ужываюцца ў сказе замест назоўнікаў у якасці дзейніка, напрыклад: Liz likes tea. (Ліз любіць чай.) = **She** likes tea. (**Яна** любіць чай.)

Займеннік **it** ужываецца замест назоўнікаў, якія абазначаюць неадушаўлёныя прадметы або жывёл, напрыклад: Look at the cat. **It**'s funny. (**Ён** смешны.) Калі жывёліна з'яўляецца хатнім пестуном, то замест яе мянушкі ўжываецца асабовы займеннік **he** або **she**, напрыклад: I've got a budgie. **He**'s funny. (**Ён** смешны.)

Форма займенніка **you** супадае ў адзіночным і множным ліку: **you** (ты) = **you** (вы), напрыклад, на пытанне Where are **you** from? можна адказаць двума варыянтамі: **I**'m from Minsk. (Я з Мінска.) / **We**'re from Minsk. (Мы з Мінска.) у залежнасці ад таго, аднаму ці некалькім людзям задавалася гэтае пытанне.

Займеннік **I** заўсёды пішацца з вялікай літары.

2. **Займеннікі**, якія адказваюць на пытанне «чый?», «чыя?», «чыё?», «чые?», заўсёды стаяць перад назоўнікам, напрыклад: This is **my** mum. **Her** name's Lily.

# Article. / Артыкль.

Артыкль – часціна мовы, якой няма ў беларускай мове. На беларускую мову артыкль не перакладаецца. Артыкль ужываецца толькі з назоўнікам і амаль заўсёды стаіць перад ім. Часам паміж артыклем і назоўнікам стаіць прыметнік. Напрыклад: I've got **a pet**. I've got **a** nice **pet**.

У англійскай мове ёсць два артыклі:

– неазначальны **a / an**, які ўжываецца толькі з назоўнікамі, якія лічацца, у адзіночным ліку;

– азначальны артыкль **the**, які ўжываецца з назоўнікамі як у адзіночным, так і ў множным ліку.

Калі слова пачынаецца з зычнага гука, перад ім выкарыстоўваецца артыкль **a**, напрыклад: **a r**abbit, **a h**ot dog, **a cat**. Калі слова пачынаецца з галоснага гука, перад ім выкарыстоўваецца артыкль **an**, напрыклад: **an e**lephant, **an a**nimal, **an** egg.

Калі перад назоўнікам стаіць адзін з займеннікаў **my**, **your**, **his**, **her**, **its**, **our**, **their**, артыкль не ўжываецца, напрыклад: This is **my** family.

# The verb “to be”. / Дзеяслоў «быць».

Дзеяслоў «быць» выкарыстоўваецца для таго, каб сказаць:

– як нас завуць: I’**m** Sasha. He’**s** Mike. They’**re** Bim and Bom. My name’**s** Sasha. His name’**s** Mike;

– колькі нам гадоў: I’**m** eight. He’**s** nine;

– якія ў нас настрой, самаадчуванне: I’**m** fine. He’**s** very well. We **aren’t** very well;

– адкуль мы: I’**m** from Belarus. He’**s** from Africa. She’**s** from America.

Дзеяслоў «быць» выкарыстоўваецца таксама для таго, каб назваць:

– прадмет, чалавека ці жывёліну: It’**s** a book. I’**m** a pupil. It’**s** a cat. They’**re** tigers;

– нумар тэлефона: My phone number **is** 7553577;

– колер прадмета, жывёліны або чалавека: The table **is** brown. Susie **is** black and white;

– якасць прадмета, жывёліны або чалавека: The cake **is** yummy. Lucky **is** funny. My mum **is** beautiful.

Дзеяслоў «быць» выкарыстоўваецца для таго, каб паказаць на каго-небудзь або што-небудзь. Напрыклад: This **is** my family. This **is** a bag.

**(+) Positive sentences.**
Сцвярджальныя сказы.

| **Full form.** Поўная форма. | **Short form.** Скарочаная форма. |
|---|---|
| I **am** happy. | I’**m** happy. |
| You **are** happy. | You’**re** happy. |
| He **is** happy. | He’**s** happy. |
| She **is** happy. | She’**s** happy. |
| It **is** happy. | It’**s** happy. |
| We **are** happy. | We’**re** happy. |
| They **are** happy. | They’**re** happy. |

| (–) Negative sentences.<br>Адмоўныя сказы. | |
|---|---|
| **Full form.**<br>Поўная форма. | **Short form.**<br>Скарочаная форма. |
| I **am not** sad. | I**'m not** sad. |
| You **are not** sad. | You **aren't** sad. |
| He **is not** sad. | He **isn't** sad. |
| She **is not** sad. | She **isn't** sad. |
| It **is not** sad. | It **isn't** sad. |
| We **are not** sad. | We **aren't** sad. |
| They **are not** sad. | They **aren't** sad. |

| (?) Questions and short answers.<br>Пытальныя сказы і кароткія адказы. |
|---|
| **Are** you from Britain? – Yes, I **am**. Yes, we **are**. / No, I'**m** not. No, we **are**n't. |
| **Is** he from Britain? – Yes, he **is**. / No, he **is**n't. |
| **Is** she from Britain? – Yes, she **is**. / No, she **is**n't. |
| **Is** it from Britain? – Yes, it **is**. / No, it **is**n't. |
| **Are** they from Britain? – Yes, they **are**. / No, they **are**n't. |

## Plural Nouns. / Множны лік назоўнікаў.

Назоўнікі ў англійскай мове маюць два лікі – адзіночны і множны: a rabbit – rabbits. Звычайна множны лік назоўнікаў утвараецца з дапамогай канчатка **-s**: a cat – two cat**s** (кот – два каты), a dog – two dog**s** (сабака – два сабакі); радзей з дапамогай канчатка **-es**: fox – fox**es**, box – box**es**.

Канчатак множнага ліку **-s** вымаўляецца [s] пасля глухіх зычных, напрыклад: cat**s**, rat**s**, desk**s**; [z] пасля звонкіх зычных і галосных, напрыклад: hamster**s**, bed**s**, table**s**. Канчатак множнага ліку **-es** вымаўляецца [ɪz], напрыклад: tortois**es**, fox**es**, box**es**.

## The verb “to have (got)”. / Дзеяслоў «мець».

Дзеяслоў «to have (got)» ужываецца для таго, каб:

– сказаць пра тое, што ў нас ёсць што-небудзь ці хто-небудзь: I’**ve got** a cat. (Я маю ката. = У мяне ёсць кот.) He’**s got** red hair (Ён мае рыжыя валасы. = У яго рыжыя валасы.) She’**s got** a brother. (У яе ёсць брат.);

– сказаць пра тое, што ў нас няма чаго-небудзь ці каго-небудзь: I **haven’t got** a cat. (Я не маю ката. = У мяне няма ката.) He **hasn’t got** red hair. I **haven’t got** a sister. She **hasn’t got** a brother;

– запытаццца ў іншага чалавека, ці ёсць у яго што-небудзь ці хто-небудзь: **Have** you **got** a granny? **Have** you **got** a budgie? **Has** she **got** a parrot? **Has** he **got** a grandad?

| **(+) Positive sentences.** Сцвярджальныя сказы. | |
|---|---|
| **Full form.** Поўная форма. | **Short form.** Скарочаная форма. |
| I **have got** a cat. | I’**ve got** a cat. |
| You **have got** a cat. | You’**ve got** a cat. |
| He **has got** a cat. | He’**s got** a cat. |
| She **has got** a cat. | She’**s got** a cat. |
| It **has got** a cat. | It’**s got** a cat. |
| We **have got** a cat. | We’**ve got** a cat. |
| They **have got** a cat. | They’**ve got** a cat. |

| (–) Negative sentences.<br>Адмоўныя сказы. | |
|---|---|
| **Full form.**<br>Поўная форма. | **Short form.**<br>Скарочаная форма. |
| I **have not got** a dog. | I **haven't got** a dog. |
| You **have not got** a dog. | You **haven't got** a dog. |
| He **has not got** a dog. | He **hasn't got** a dog. |
| She **has not got** a dog. | She **hasn't got** a dog. |
| It **has not got** a dog. | It **hasn't got** a dog. |
| We **have not got** a dog. | We **haven't got** a dog. |
| They **have not got** a dog. | They **haven't got** a dog. |

| (?) Questions and short answers.<br>Пытальныя сказы і кароткія адказы. |
|---|
| **Have** you **got** a cat? – Yes, I **have**. Yes, we **have**. / No, I **have**n't. No, we **have**n't. |
| **Has** he **got** a cat? – Yes, he **has**. / No, he **has**n't. |
| **Has** she **got** a cat? – Yes, she **has.** No, she **has**n't. |
| **Has** it **got** long hair? – Yes, it **has**. No, it **has**n't. |
| **Have** they **got** a cat? – Yes, they **have**. No, they **have**n't. |

## The verb “can”. / Дзеяслоў «умець, магчы».

Дзеяслоў «can» ужываецца для таго, каб:

– сказаць пра тое, што мы ўмеем што-небудзь рабіць: I **can** read. He **can** sing. We **can** dance;

– сказаць пра тое, што мы не ўмеем чаго-небудзь рабіць: Bill **can’t** swim. She **can’t** run;

– запытацца ў іншага чалавека пра тое, што хто-небудзь умее рабіць: **Can** you play tennis? **Can** she skate? **Can** it swim?

Дзеяслоў «can» ужываецца таксама для выказвання просьбы ці дазволу, напрыклад: **Can** I go out? – Yes, you **can**.

| **(+) Positive sentences.**<br>Сцвярджальныя сказы. | **(–) Negative sentences.**<br>Адмоўныя сказы.<br>Full / short form.<br>Поўная / скарочаная форма. |
|---|---|
| I **can** run. | I **cannot / can’t** sing. |
| You **can** run. | You **cannot / can’t** sing. |
| He **can** run. | He **cannot / can’t** sing. |
| She **can** run. | She **cannot / can’t** sing. |
| It **can** run. | It **cannot / can’t** sing. |
| We **can** run. | We **cannot / can’t** sing. |
| They **can** run. | They **cannot / can’t** sing. |

| **(?) Questions and short answers.**<br>Пытальныя сказы і кароткія адказы. |
|---|
| **Can** I go out? – Yes, you **can**./ No, you **can**’t. |
| **Can** you jump? – Yes, I **can**. Yes, we **can**. / No, I **can**’t. No, we **can**’t. |
| **Can** he jump? – Yes, he **can**. / No, he **can**’t. |
| **Can** she jump? – Yes, she **can**. / No, she **can**’t. |
| **Can** it jump? – Yes, it **can**. / No, it **can**’t. |
| **Can** we go out? – Yes, you **can**. / No, you **can**’t. |
| **Can** they jump? – Yes, they **can**. / No, they **can**’t. |

## Numerals. / Лічэбнікі.

## 1–20

Лічэбнікі абазначаюць лічбы і адказваюць на пытанне «колькі?». Яны перадаюць колькасць, напрыклад: **thirteen** desks, **three** boys, **eight** giraffes.

| | |
|---|---|
| **1** – one | **11** – eleven |
| **2** – two | **12** – twelve |
| **3** – three | **13** – thirteen |
| **4** – four | **14** – fourteen |
| **5** – five | **15** – fifteen |
| **6** – six | **16** – sixteen |
| **7** – seven | **17** – seventeen |
| **8** – eight | **18** – eighteen |
| **9** – nine | **19** – nineteen |
| **10** – ten | **20** – twenty |